# ПАЧАТКОВАЯ ШКОЛА

**9**
**1999**

ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

## ЗМЕСТ

*На мяжы стагоддзяў*

**Н. Ваніна.** Прарок ці проста аўтар? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2

*У Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Пачатковая школа ў 1999/2000 навучальным годзе . . . . . . . . . . . . . 4

*Навука*

**Л. У. Марышчук, Г. У. Пішчова.** Актывізацыя разумовага развіцця дзяцей сродкамі навучання грамаце . . . . . . . . . . . . . . . . . 6

*Навучанне. Выхаванне*

**А. Клышка.** Букварь: страницы и уроки. Методические рекомендации . . 9

**М. Б. Антипова.** Особенности учебника "Русский язык, 1 класс". Для школ с белорусским языком обучения . . . . . . . . . . . . . . . . 14

Быццам птушка фенікс . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16

*Навучанне. Выхаванне*

**Н. М. Пятахіна.** Радасць пазнання. Урокі матэматыкі ў пачатковых класах . . .21

**Л. В. Лешчанка, Л. А. Бондарава.** Задачы пра рух . . . . . . . . . . . . . .22

**А. В. Верниковская, Е. С. Грабчикова.** Русский язык во II классе школ с русским языком обучения. Новый учебно-методический комплекс . . .24

*Працуем з шасцігодкамі*

**Л. У. Жук.** Мы розныя, мы аднолькавыя. Урок па курсу "Чалавек і свет" . . . .28

*Спадчына*

**Л. М. Салавей.** Вобразы беларускай міфалогіі . . . . . . . . . . . . . . . 29

*Нестандартны ўрок*

**Л. И. Глушко.** Ехал "зайчик" в трамвае. Занятия по теме "Правила поведения в общественном транспорте" (I класс) . . . . . . . . . . . .30

*Экалогія*

**И. С. Руденок.** Войди в храм природы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32

*Наша чытанка*

**Я. Крамко.** Па чарніцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34

*Здароўе*

**В. А. Дубоўская.** Увага! Школьныя стрэсы! . . . . . . . . . . . . . . . . .35

**А. Ф. Костюк.** Вязаные игрушки . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36

На 1-й с. вокладкі — Гродна. Касцёл і кляштар бернардзінцаў.
На 4-й с. вокладкі — адзін з куткоў Гродна. Фота **У. Гузоўскага**.

*Выходзіць са студзеня 1992 года.*

**Заснавальнікі:**
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь,
Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка,
калектыў рэдакцыі часопіса "Пачатковая школа".

***Галоўны рэдактар***
**Н. Г. ВАНІНА.**

***Рэдакцыйная калегія:***
Н. С. Валодзькіна,
У. А. Гузоўскі (адказны сакратар),
У. Л. Дрозд,
Г. Дз. Дылян,
Г. Я. Кавалёва,
Н. Дз. Кайгародава (намеснік галоўнага рэдактара),
С. М. Клімковіч,
А. А. Крукава,
Л. Ф. Кузняцова,
А. А. Палоннікаў,
Т. У. Рэутовіч,
Т. М. Савельева,
Н. А. Сторажава,
Г. У. Трафімава,
М. С. Фяськоў.

***Стыльрэдактар***
М. Г. Вінаградава.

***Камп'ютэрны набор***
Н. Ф. Кланюк,
Т. А. Няборскай.

***Камп'ютэрны дызайн***
В. В. Дняпроўскага.

***Паважаныя чытачы!***

***Калі вы жадаеце набыць асобныя нумары часопіса "Пачатковая школа" мінулых гадоў, звяртайцеся ў магазін "Метадычная кніга" па адрасу: 220074, г. Мінск, вул. Берута, д. 22, к. 1.***

***Не забудзьцеся прадоўжыць падпіску на наш часопіс!***

© 1. "Пачатковая школа" № 9

чальным годзе будзе ажыццяўляцца па падручніках і вучэбных дапаможніках, што выпускаюцца выдавецтвамі рэспублікі па ўсіх прадметах вучэбнага плана як для 11-гадовай, так і для 12-гадовай агульнаадукацыйнай школы.

15. Навучанне ў падрыхтоўчым класе пачынаецца з інтэграванага курса "Уводзіны ў школьнае жыццё". Гэты курс праводзіцца ў верасні на працягу 20 — 21 дня. Усе астатнія прадметы пачнуць вывучацца пасля заканчэння курса (аўтары праграм — Н. Я. Кушнір і Г. У. Трафімава).

16. У беларускамоўных школах вучні падрыхтоўчых класаў будуць працаваць па падручніку "Буквар", вучэбных дапаможніках "Пропісь 1", "Пропісь 2", "Пісьмо" (аўтар — А. К. Клышка).

Прыкладнае планаванне ўрокаў навучання грамаце (чытанне і пісьмо) надрукавана ў часопісе "Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа", № 1, 1998 г. (аўтар — Н. У. Піскун).

Метадычныя ўказанні па выкарыстанні гэтага комплексу змешчаны ў вучэбна-метадычным дапаможніку "Па старонках буквара" (аўтар — А. К. Клышка), а таксама ў часопісе "Пачатковая школа" (№ 5, 6, 8, 9, 12 за 1998 г. — артыкулы настаўніцы СШ № 190 г. Мінска Н. У. Піскун "Работа па буквару А. Клышкі").

Вучні падрыхтоўчых агульнаадукацыйных школ з рускай мовай навучання пачнуць працаваць па новым вучэбна-метадычным комплексе па навучанні грамаце: "Букварь", "Пропись 1", "Пропись 2", "Письмо" (аўтар — А. К. Клышка).

Пры наяўнасці ў школьных бібліятэчных фондах вучэбна-метадычнага комплексу "Букварь А, Б, В, Г", "Пропись 1", "Пропись 2", "Письмо" (аўтар — Н. А. Сторажава), выдадзенага для рускамоўных школ у 1998/99 навучальным годзе, варта выкарыстаць яго пры навучанні дзяцей грамаце і ў 1999/2000 навучальным годзе.

На ўроках навучання грамаце ў беларускамоўных школах настаўнікі могуць таксама карыстацца вучэбным дапаможнікам "Адна сям'я ад А да Я" (аўтары — С. С. Аніскевіч, Н. А. Сторажава), вучэбна-наглядным дапаможнікам "Азбука — спадарожніца твая" (аўтар-складальнік — І. А. Гімпель), вучэбна-метадычным дапаможнікам "Па старонках буквара" (аўтар — А. К. Клышка); у рускамоўных школах — выданнямі "Азбука от А до Я" (аўтар-складальнік — І. А. Гімпель), а таксама "Обучение чтению", "Обучение письму" (аўтар — Н. А. Сторажава).

Для арганізацыі заняткаў па курсе "Асновы моўнай культуры" (па выбары) у падрыхтоўчым класе выкарыстоўваецца дапаможнік для настаўнікаў "З роднай мовай дзень за днём" (аўтар — Т. М. Шылько).

17. У школах з беларускай і рускай мовамі навучання вучні будуць працаваць па вучэбна-метадычным комплексе, у які ўваходзяць вучэбныя дапаможнікі "Матэматыка", ч. 1, 2, 3, 4 (аўтары — А. А. Столяр і інш.), "Сшытак для самастойных праверачных работ па матэматыцы" (аўтары — У. Л. Дрозд, М. А. Урбан, А. М. Шчыракоў), "Матэматыка ў падрыхтоўчым класе" (аўтар — А. Т. Катасонава), "Табліцы па матэматыцы ў першым класе" (аўтары — М. І. Касабуцкі і інш.).

Акрамя гэтага, рыхтуючыся да ўрокаў матэматыкі, настаўнік можа выкарыстаць вучэбна-метадычныя дапаможнікі "Пачатковае навучанне: матэматыка і лагічнае мысленне" (аўтары — В. М. Мядзведская, Н. А. Маташук), "Матэматыка ў 2-м класе" (аўтары — А. Т. Катасонава і інш.).

18. Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, якія выйшлі для І класа к 1998/99 навучальнаму году малым тыражом (6 — 7 тыс. экзэмпляраў), сёлета давыдадзены на поўны кантынгент вучняў. Гэта датычыцца прадметаў "Беларуская мова" (граматыка і літаратурнае чытанне) для школ з беларускай мовай навучання, а таксама "Беларуская мова" і "Русский язык" (граматыка і літаратурнае чытанне), "Правапіс" для школ з рускай мовай навучання.

19. Сёлета вучні І класаў беларускамоўных школ пачнуць працаваць па новым падручніку "Русский язык" і вучэбным дапаможніку "Тетрадь по русскому языку для І класса" (аўтар — М. Б. Анціпава). Для правядзення ўрокаў па рускай мове ў І класе школ з беларускай мовай навучання варта выкарыстоўваць дадатковы дыдактычны матэрыял па рускай мове (аўтар — А. М. Катонава), які друкуецца ў часопісе "Пачатковая школа" ("Сказки о мальчике Найде и необыкновенных волшебниках из страны ЛИРландии").

Для школ з беларускай мовай навучання к пачатку навучальнага года выходзіць новы вучэбна-метадычны комплекс на рускай мове для ІІ класа: "Русский язык" (аўтары — А. В. Вернікоўская, А. С. Грабчыкава, Н. П. Дзёміна) і "Тетрадь по русскому языку" (аўтары — А. В. Вернікоўская, А. С. Грабчыкава).

20. Вучэбныя дапаможнікі разавага карыстання (сшыткі на друкаванай аснове) для падрыхтоўчых і І класаў выпускаюцца за кошт дзяржавы.

Вучэбныя дапаможнікі для ІІ — IV класаў разавага карыстання (сшыткі на друкаванай аснове) з'яўляюцца часткай вучэбна-метадычных комплексаў па беларускай, рускай і замежнай мовах, выяўленчаму мастацтву, тэхналогіі і абавязкова выкарыстоўваюцца ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. Набыццё такіх дапаможнікаў ажыццяўляецца за кошт бацькоў.

21. Пры наяўнасці ў класе інтэграванага навучання 3 чалавек з цяжкай паталогіяй аднароднага характару або 6 чалавек з аднароднымі неглыбокімі парушэннямі ці не больш за 2 чалавекі з цяжкай паталогіяй неаднароднага характару або не больш за 4 чалавекі з неаднароднымі неглыбокімі парушэннямі ў ім працуюць настаўнік і настаўнік-дэфектолаг. Настаўнік-дэфектолаг праводзіць заняткі з дзецьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця па асноўных прадметах або складаных тэмах гэтых прадметаў асобна.

Пры наяўнасці ў класе інтэграванага навучання меншай колькасці вучняў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця настаўнік-дэфектолаг праводзіць карэкцыйна-педагагічныя заняткі з разліку 8 гадзін у тыдзень на аднаго вучня з цяжкай паталогіяй і 4 гадзіны ў тыдзень на аднаго вучня з неглыбокімі парушэннямі.

Пры арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў класах інтэграванага навучання трэба карыстацца "Інструкцыйна-метадычным пісьмом аб арганізацыі работы ў класах інтэграванага навучання і асаблівасцях тарыфікацыі і аплаты працы настаўнікаў, якія працуюць у гэтых класах" (Зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, № 10, 1998 г.).

Пры правядзенні фарміруючага эксперыменту з вучнямі І класа Татаркаўскай сярэдняй школы, вынікі якога былі прадстаўлены ў № 1 "Пачатковай школы" за гэты год, на ўроках навучання грамаце прымяняўся комплекс развіццёвай тэхналогіі. У ім выкарыстоўваліся формы і метады развіццёвага навучання, якія спрыяюць згуртаванню дзіцячага калектыву, стварэнню на ўроку атмасферы, што здымае страх перад няправільным адказам (уздзеянне на эмацыянальную сферу), стымулююць пазнавальную актыўнасць (уздзеянне на кагнітыўную сферу), а гэта станоўча ўплывае на матывацыю вучэння.

Комплекс элементаў развіццёвай тэхналогіі ўключаў арганізацыю дзіцячага калектыву, навучанне школьнікаў такім відам моўнай дзейнасці, як чытанне і пісьмо. Вялікая ўвага ўдзялялася развіццю вуснай моўнай дзейнасці, гэтак жа як і яе аснове — унутранай мове.

Пачаткам карпатлівай работы па выхаванню ў дзяцей культуры мовы, умення слухаць не толькі настаўніка, але і аднакласнікаў, задаваць пытанні і аргументавана абараняць свой пункт гледжання, умення весці вучэбны дыялог з'яўляецца курс "Уводзіны ў школьнае жыццё". З першых дзён навучання дзіцяці ў школе пачынаецца фарміраванне вучэбнага дзеяння кантролю і ацэнкі сваіх дзеянняў, навыку пошуку ўзаемасувязі паміж умовай задачы і яе вынікам.

З сярэдзіны першага месяца навучання разгортваецца работа па вывучэнню літар (але не навучанню чытанню) і падрыхтоўцы да пісьма. Папярэдняе вывучэнне літар здымае даволі актуальную для сельскай школы праблему дзялення вучняў на тых, хто ведае літары або частку іх, і тых, хто зусім не ведае літар. Да таго ж дзеці прыходзяць у школу з вялікім жаданнем навучыцца чытаць і пісаць, таму ўсю работу трэба будаваць такім чынам, каб захаваць гэта жаданне. Так, абмеркаванне пытання "На што падобна літара?" стымулюе цікавасць школьнікаў да вучэбнай задачы. Цікава ўсім — і тым, хто ведае літары, і тым, хто знаёміцца з імі ўпершыню. Кожны вучань рухаецца ў сваім тэмпе, у залежнасці ад уласнага ўзроўню гатоўнасці да навучання, а над настаўнікам не вісіць дамоклаў меч патрабаванняў праграмы. На занятках можна выкарыстоўваць займальныя вершы Г. Віеру, С. Маршака, Г. Сапгіра. Галоўнае — абудзіць творчае ўяўленне вучняў.

Дзеці пачынаюць разглядаць будзённыя прадметы з розных пунктаў гледжання, вучацца вылучаць іх характэрныя рысы, параўноўваць прадметы паміж сабой. Адным літара Т уяўляецца ў выглядзе цвіка, другім — у выглядзе кветкі на сцяблінцы, раскрытага парасона, мухамора. Некаторым літара Ж нагадвае матылька, які ляціць, а літара К — матылька, які склаў крыльцы. Адначасова развіваюцца навыкі моўных зносін дзяцей — ім жа неабходна растлумачыць аднакласнікам, чым падобна на пэўны прадмет тая ці іншая літара. Часам вучні сачыняюць аповеды аб прыгодах і цудоўных ператварэннях літары. Сама пастаноўка пытання абумоўлівае разнастайнасць адказаў, а няправільных адказаў проста не можа быць. Гэта разня-

# АКТЫВІЗАЦЫЯ РАЗУМОВАГА РАЗВІЦЦЯ ДЗЯЦЕЙ СРОДКАМІ НАВУЧАННЯ ГРАМАЦЕ

вольвае дзяцей, дазваляе смялей выказваць сваю думку, фарміруе навык аргументацыі выказвання.

Наступным этапам вывучэння літар з'яўляецца маляванне вывявы літары, схаванай у нейкім прадмеце. Заданні нагадваюць "кляксы Роршаха" і могуць адыгрываць ролю тэстаў. Зразумела, настаўнік не павінен выкарыстоўваць іх у якасці метаду псіхалагічнай дыягностыкі, бо гэта справа высокакваліфікаванага спецыяліста. Аднак адказы дазваляюць бліжэй пазнаёміцца з кожным вучнем: яго захапленнямі, ступенню інфармаванасці, надзёнымі патрэбамі, праблемамі ў сям'і. Адзін вучань бачыць у літары Л вуду з рыбкай на кручку, а другі — складзены рэмень; для аднаго літара О падобна на блінец, для другога — на аўтамабільную фару. Гэту інфармацыю настаўнік можа выкарыстаць пры пабудове вучэбна-выхаваўчага працэсу з улікам індывідуальных асаблівасцей дзяцей [2].

Засваенне зрокавага вобраза вывучаемай літары адбываецца ў працэсе канструявання яе з палачак для лічэння, кубікаў, мазаікі, што спрые развіццю прасторавага мыслення і дробнай мускулатуры рук. К моманту вывучэння тэмы "Гукі і літары" ўсе вучні ведаюць азбуку.

На падрыхтоўчым этапе навучання пісьму, акрамя вырашэння задач, прадугледжаных праграмай, адбываецца знаёмства з графічнай сістэмай літар, аснову якой складаюць 8 пастаянных структурных адзінак: прамая лінія, лінія з закругленнем з аднаго боку, з закругленнем з двух бакоў, з пятлёй, з чацвяртным авалам, плаўная лінія, авал, паўавал [1].

У вучняў фарміруюцца дакладныя зрокава-рухальныя вобразы элементаў літар шляхам іх пісьма ў сшытку для малявання. Перш за ўсё ажыццяўляецца разметка рабочага аркуша. Гэта вельмі адказны этап работы. Дзеці авалодваюць навыкамі правільнага расчэрчвання аркуша, у іх выпрацоўваецца адзіны рабочы рытм, трэніруюцца вакамер і дробная мускулатура рук. Спачатку мэтазгодна абмеркаваць з вучнямі паварот аркуша, памеры рабочага радка, спосаб правядзення разметкі і выбраць аптымальны варыянт. Пасля гэтага настаўнік фармулюе алгарытм разметкі аркуша:

1. Размясці аркуш гарызантальна.
2. Вазьмі чырвоную мерку і адкладзі з верхняга левага вугла ўніз адну яе даўжыню, адзнач гэта месца алоўкам.
3. Адкладзі з верхняга правага вугла ўніз адну даўжыню меркі і адзнач гэта месца алоўкам.
4. Пры дапамозе лінейкі злучы меткі.

Аналагічным чынам праводзяцца астатнія лініі. Пры разметцы вучні ў якасці мерак выкарыстоўваюць аловак, лінейку і набор лічыльных палачак рознай даўжыні. Вышыня дадатковага радка — 5 см (чырвоная мерка), рабочага — 3 см (сіняя мерка). На аркушы змяшчаюцца два рабочыя радкі. Размеры можна вар'іраваць.

На першых 3 — 4 занятках настаўнік акцэнтуе ўвагу дзяцей на кожнай аперацыі алгарытму. Па меры набыцця школьнікамі навыку разметкі работа каменціруецца адным з вучняў. На апошніх занятках разметка выконваецца дзецьмі самастойна — навык сфарміраваны.

Далей настаўнік знаёміць школьнікаў з адным з элементаў графічнай сістэмы. Ён піша гэты элемент, каменціруючы кожны рух сваёй рукі. Вучні, суадносячы каментарый педагога з рухам яго рукі, запамінаюць алгарытм дзеянняў (рухаў), неабходны для напісання элемента або ў далейшым літары. Праілюструем гэта на прыкладзе напісання страчнога элемента "лінія з закругленнем унізе ўправа":

— Пачынаем ад верхняй лінейкі. Спускаем уніз нахіленую прамую лінію. Не даходзячы трошкі да ніжняй лінейкі, робім закругленне ўправа. Дакранаемся да ніжняй лінейкі і плаўна вядзём уверх.

Практыкаванне паўтараецца некалькі разоў у залежнасці ад складанасці элемента. Затым вучні пад дыктоўку настаўніка імітуюць пісьмо элемента ў паветры, шэптам паўтараючы алгарытм руху. Потым элемент пішацца ў сшытку. Пасля некалькіх паўтарэнняў можна прыступаць да пісьма па скарочанаму алгарытму, у якім указваецца толькі паслядоўнасць рухаў рукі (вядзём лінію ўніз, закругляем, вядзём уверх), і да пісьма пад лічэнне. Падкрэсліваем, што галоўным у гэты перыяд з'яўляецца засваенне вучнямі напісання кожнага элемента і дасягненне агульнага тэмпу работы.

Важна, каб дзіця навучылася кантраляваць і ацэньваць сваё дзеянні. Для гэтага вучань спачатку сумесна з настаўнікам, а затым самастойна ўзнаўляе алгарытм напісання элемента і ўдакладняе, на якой ступені адбыўся збой, што дапамагае яму знайсці і выправіць памылку. Аналагічна праводзіцца навучанне пісьму літар і іх злучэнняў.

На падрыхтоўчым этапе навучання (перад работай у прописі) ажыццяўляецца штрыхоўка фігур і маляванне бардзюраў. Маляванне бардзюраў адбываецца наступным чынам: капіраванне ўзору, дадзенага настаўнікам; прадаўжэнне ўзору, змешчанага ў сшытку на друкаванай аснове; маляванне бардзюра пад дыктоўку настаўніка (графічны дыктант); расфарбоўванне бардзюра, намаляванага пад дыктоўку настаўніка; самастойнае складанне бардзюра.

Пісьмо графічных элементаў, штрыхоўка фігур і маляванне бардзюраў спрыяюць упэўненаму і дакладнаму выкананню заданняў у прописі, бо вучні ўжо ўмеюць працаваць у адзіным тэмпе, пісаць пад дыктоўку настаўніка і пад лічэнне, валодаюць навыкамі кантролю за алгарытмам напісання элементаў.

Такім чынам, уключэнне комплексу элементаў развіццёвай тэхналогіі ва ўрокі курса "Уводзіны ў школьнае жыццё", па-першае, дазволіла з дапамогай прапедэўтычнага вучэбнага матэрыялу закласці асновы вучэбнай дзейнасці. Па-другое, дало магчымасць дзецям у звыклай для іх гульнявой форме навучыцца нормам паводзін і формам супрацоўніцтва на ўроку.

Першапачатковай задачай урокаў навучання грамаце (у далейшым урокаў чытання і пісьма) з'яўляецца азнаямленне школьнікаў са словам як адзінкай мовы. Гэта знаёмства адбываецца ў час работы з мадэлямі — сімваламі слоў [4]. Мадэль — сімвал слова 1  мае значэнне прадметнасці без канкрэтнага лексічнага значэння і з'яўляецца, такім чынам, абагульненнем усіх назоўнікаў, г. зн. граматычнай мадэллю гэтай часціны мовы. Мадэль — сімвал слова 2  з'яўляецца граматычнай мадэллю прыметніка, мадэль — сімвал слова 3  — граматычнай мадэллю дзеяслова.

Увядзенне мадэлей — сімвалаў слоў адбываецца ў час дыдактычнай гульні. Дапамагаючы героям казкі Алана Мілна Віні-Пуху і Пятачку вырашыць праблему — ШТО падарыць асляняці Іа, ЯКІ шарык выбраць у лясным магазіне ў якасці падарунка, ШТО РАБІЦЬ, каб паспяхова даставіць яго асляняці, дзеці "селяць" словы ў куфэркі. Назоўнікі (вучні называюць іх словамі, якія адказваюць на пытанне **хто?** ці **што?**) — у куфэрак з адным замком, прыметнікі — у куфэрак з двума замкамі, дзеясловы — у куфэрак з трыма замкамі.

Замацаванне абагульненага значэння граматычнай мадэлі слова адбываецца ў гульнях тыпу "Адгадай", "Даскажы слоўца", "Наадварот". Гэтыя гульні таксама спрыяюць пашырэнню слоўнікавага запасу дзяцей; вучаць іх гаварыць правільна, дакладна, вобразна; практычна знаёмяць з полісеміяй, сінаніміяй і антаніміяй; развіваюць уяўленне і творчае мысленне.

Пры правядзенні гульні "Адгадай" адзін з вучняў выходзіць з класа. Настаўнік паказвае прадмет або яго выяву, а дзеці дамаўляюцца, словы якой мадэлі (з якога куфэрка) яны будуць выкарыстоўваць пры апісанні прадмета. Напрыклад, настаўнік паказвае мяч. Вучні выбіраюць мадэль 1. На роздум даецца 10 — 15 секунд, пасля чаго дзеці паднімаюць рукі — яны гатовы адказваць. Вучань запрашаецца ў клас. Школьнікі па "ланцужку" апісваюць мяч: ён падобны на кавун, на сонейка, на клубок, на вітамінку. Пры апісанні лінейкі былі выкарыстаны словы з другога куфэрка (мадэль 2): доўгая, плоская, карычневая, гладкая, вымяральная. Словы з куфэрка з трыма замкамі (мадэль 3) спатрэбіліся пры апісанні пчалы: лятае, гудзе, джаліць, апыляе, кружыцца, танцуе, узлятае, садзіцца.

У ходзе гульні "Даскажы слоўца", дзе была выкарыстана методыка Н. А. Сторажавай [5], настаўнік называе слова (назоўнік, прыметнік або дзеяслоў) і ўказвае на куфэрак (мадэль — сімвал слова), з якога вучні выбіраюць патрэбныя ім словы.

1. Настаўнік называе слова **яблык** і паказвае мадэль 2. Вучні апісваюць яблык па "ланцужку": смачны, спелы, круглы, салодкі, жоўты, гладкі, румяны, сакавіты, хрусткі.

2. Настаўнік вымаўляе слова **вясёлы** і ўказвае на мадэль 1. Вучні могуць змяняць прыметнікі па родах і ліках: вясёлы хлопчык, вясёлае сонейка, вясёлая гульня, вясёлы карнавал, вясёлыя мультфільмы.

3. Прапануецца слова **ляціць** і дэманструецца мадэль 1. Адказваючы, дзеці змяняюць дзеяслоў па ліках: ляціць камар, самалёт, ракета, час, пыл, страла, мяч, камень; ляцяць аблокі, лісточкі, канікулы, думкі, пёры.

4. Настаўнік называе слова **лес** і паказвае мадэль 3. Падбіраючы словы, вучні ўжываюць іх у прамым і пераносным значэнні: лес расце, зелянее, стаіць, шуміць, укрывае, радуе.

У гульні "Наадварот" дзеці падбіраюць да слоў, прапанаваных настаўнікам, процілеглыя. Звяртаецца ўвага на аднароднасць груп слоў, указваецца адпаведная мадэль.

Па меры засваення правіл гульні роля настаўніка пераходзіць да вучняў. Праводзяцца конкурсы на больш дакладныя, забаўныя і арыгінальныя адказы.

У ходзе гульняў "Адгадай" і "Даскажы слоўца" школьнікі абстрагуюцца ад вузкага лексічнага значэння слоў і прыходзяць да разумення іх граматычнай спалучальнасці. Напрыклад, пры падборы дзеясловаў да слова **аблокі** дзеці прапануюць такія варыянты: аблокі плывуць, ляцяць, танцуюць, гуляюць, спаборнічаюць, мараць (і тады плывуць павольна-павольна), б'юцца (і тады наплываюць адно на адно), заміраюць. Пры выкарыстанні "нетрадыцыйных" спалучэнняў дзіця дае іх тлумачэнне. Такім чынам, прымяненне гульняў актывізуе ўяўленне вучняў, развівае іх цікавасць да граматыкі. У далейшым гульні з мадэлямі служаць адпраўным пунктам пры вывучэнні часцін мовы.

Выкарыстанне мадэлей — сімвалаў слоў дае магчымасць змяніць схему вывучэння структуры сказа, што дазваляе хутчэй сфарміраваць навык, а затым і ўменне правільна будаваць выказванне. Графічная мадэль сказа, складзеная па традыцыйнай метадыцы, дэманструе толькі колькасць слоў, што ў яго ўваходзяць, не забяспечваючы разумення структуры сказа. Прымяненне мадэлей аптымізуе працэс вывучэння структуры сказа, бо яны сваім абагульненым значэннем указваюць пазіцыю часціны мовы ў сказе таго ці іншага тыпу.

Напрыклад, вучні складаюць сказы па схемах:



*Адлятаюць жураўлі.*



*Кружацца асеннія лісточкі.*



*Дзеці збіраюць грыбы.*

А таксама складаюць схемы простых двухсастаўных сказаў:

*Дзяцел дзяўбе старое дрэва.*



*Клапатлівая вавёрка збірае спелыя арэхі.*



Так на аснове графічнай мадэлі вучні атрымліваюць нагляднае ўяўленне аб структуры сказа і сінтаксічным значэнні часцін мовы.

Важным накірункам у асноўным (букварным) перыядзе навучання грамаце з'яўляецца друкаванне слоў. Работа пачынаецца на этапе ўвядзення гука-літарнага разбору і высвятлення ролі галосных і працягваецца ўвесь навучальны год. У мэтах эмацыянальнай стымуляцыі вучняў пры такой дзейнасці была распрацавана сістэма гульняў, у тым ліку звязаных з пераўтварэннем слоў ("ланцужкі" слоў са змяненнем адной літары), складаннем з двух слоў аднаго, складаннем некалькіх слоў з літар аднаго слова і да т. п. Гульні з літарамі і словамі стымулююць цікаўнасць школьнікаў, пашыраюць іх слоўнікавы запас, вучаць уважліва ставіцца да літарнай і гукавой структуры слова, фарміруюць у дзяцей навыкі вучэбнай самастойнасці.

Сутнасць многіх гульняў заключаецца ў пераўтварэнні літарнага складу зыходнага слова. Напрыклад, дзецям прапануецца ператварыць слова **сом** у слова **рак** (можна прымацаваць да дошкі выявы гэтых жывёл). Спачатку вучні складаюць гукавую мадэль слова **сом**, праводзячы фанемны разбор па схеме:

1. Скажы слова і паслухай сябе.
2. Працягні (выдзелі голасам) першы гук у поўным слове, назаві і ахарактарызуй гэты гук.
3. Пазнач выдзелены гук умоўным знакам (галосны — чырвоным квадратам, мяккі зычны — зялёным квадратам, цвёрды зычны — сінім квадратам).
4. Працягні (выдзелі голасам) другі гук у поўным слове, назаві і ахарактарызуй гэты гук.
5. Пазнач выдзелены гук умоўным знакам.
6. Правер, ці ўсе гукі выдзелены, прачытай свой запіс.

(Пры рабоце з кожным наступным гукам неабходна паўтарыць усе тры аперацыі: працягнуць і выдзеліць гук, пазначыць яго, праверыць.)

7. Знайдзі націскны склад.
8. Правер, ці атрымалася слова, для гэтага прачытай яго па схеме.

Далей вучні высвятляюць, якой літарай абазначаецца кожны гук, друкуюць слова і чытаюць яго (правяраюць). Затым, змяняючы адну з літар, друкуюць ланцужок слоў (рускіх): сом — сок — сук — лук — лак — рак, чытаюць іх.

Спачатку выкарыстоўваюцца словы, у якіх усе літары абазначаюць гукі ў моцнай пазіцыі, але абавязкова ўзнікае сітуацыя, калі дзеці сустрэнуцца з літарай, якая абазначае гук у слабай пазіцыі. Так, пры складанні ланцужка "лупа — ліпа — ліса" ўзнікае пытанне аб правільным напісанні апошняга слова. Вучні прапануюць запісаць слова на дошцы з пропускам другой літары (адразу ў сшытак пісаць нельга, бо калі пішацца **е**, то ў слове **ліпа** змяняюцца дзве літары) і абмяркоўваюць варыянты яго праверкі. Прымаецца такі: уявім, што ў нас маленькая ліса і паклічам яе ласкава — лііісачка, лііісіка. Чуем [і]. Значыць, і ў слове **ліса** трэба пісаць **і**. Слова запісваецца ў сшыткі.

У сувязі з тым што друкаванню першага слова **лупа** папярэднічаў яго фанемны разбор, настаўнік прапануе дзецям падумаць, ці адпавядаюць дадзенай схеме ўсе словы ў ланцужку. Высвятляецца, што словы **ліпа** і **ліса** да гэтай схемы не падыходзяць. Складаецца гукавая мадэль слова **ліпа**. Затым абмяркоўваецца, ці можна, не чытаючы слова, вызначыць, якой схеме яно адпавядае. Дзеці бачаць, што выбар схемы залежыць ад другой літары. Калі другая літара ў слове **а**, **о**, **у**, **ы**, то яно адпавядае першай схеме. Калі другая літара **я**, **ю**, **е**, **ё**, **і**, то — другой. Прадаўжаючы ланцужок "ліса — кіса — каса — кара — нара", вучні пераконваюцца ў правільнасці свайго назірання.

У працэсе выканання заданняў мы імкнуліся да таго, каб вучні не толькі вырашалі канкрэтныя вучэбныя задачы, але і набывалі навыкі вядзення калектыўнага вучэбнага дыялога, слухалі і адэкватна рэагавалі на выказванні таварышаў, аргументавана даказвалі свой пункт гледжання. Фарміраванню паважлівых адносін адно да аднаго, умення цаніць здагадку аднакласніка спрыялі заданні, якія дапускалі розныя варыянты адказаў.

На жаль, аб'ём артыкула дазваляе разгледзець толькі некаторыя аспекты работы па ўкараненню комплексу элементаў развіццёвай тэхналогіі на ўроках навучання грамаце. Эксперыментальная работа працягваецца. Яе вынікі могуць быць прадстаўлены пасля заканчэння вучнямі эксперыментальнага III класа пачатковай школы.

## *ЛІТАРАТУРА:*


1. Агаркова Н. Г. Развивающие возможности поэлементного обучения первоначальному письму//Начальная школа. — 1992, № 2.
2. Белый Б. И. Тест Роршаха. Практика и теория/Под ред. Л. Н. Собчик. — СПб.: Дорваль, 1992.
3. Маришук Л. В. Технология непроизвольного обучения: Методическое пособие для учителя английского языка. — Мн.: НИО, 1997.
4. Некрасова Т. В. Развивающее обучение на уроках русского языка в начальной школе (буквенный период): Методические рекомендации для учителя. — Томск: Пеленг, 1994.
5. Сторажава Н. А. Мова мая і твая: Вучу дзяцей па-беларуску. — Мн.: Выд. А. Ванін, 1993.



**Л. У. МАРЫШЧУК,**
**кандыдат педагагічных навук, г. Мінск.**
**Г. У. ПІШЧОВА,**
**настаўніца пачатковых класаў Татаркаўскай СШ**
**Асіповіцкага раёна, аспірантка НІА.**